фічныя падсістэмы, сусветны вопыт практычнай дзейнасці бібліятэк сведчаць, што апошнія вымушаны адаптавацца да новых умоў і шукаць шляхі захоўвання сваёй важкай грамадскай ролі ў якасці інфармацыйных, сацыякультурных і адукацыйных цэнтраў, гарантаў свабоднага доступу грамадзян да інфармацыі і сховішчаў ведаў для нашчадкаў.


1. *Литвинова, Н. Н.* Проблемы внедрения поисковых сервисов типа Discovery в библиотеках / Н. Н. Литвинова // Библиотековедение. – 2013. – № 6. – С. 41–45.

2. *Елисина, Е. Ю.* Электронные услуги библиотек / Е. Ю. Елисина. – СПб. : Профессия, 2010. – 304 с.

3. *Фесенко, К.* Тенденции развития электронных ресурсов и их влияние на читателей и библиотеки. Зарубежный опыт / Кирилл Фесенко // Электронные библиотеки. – 2006. – Т. 9, вып. 3 // Режим доступа: http://ebiblioteka.ru/sources/article.jsp?id=10452559.

4. *Юдина, И. Г.* Избирательное распространение информации на базе веб-сервисов: обзор интернет-ресурсов / И. Г. Юдина // Библиосфера. – 2008. – № 1. – С. 51–56.

5. *Редькина, Н. С.* Футур-прогноз развития технологии библиотеки в условиях формирования новой информационно-технологической парадигмы / Н. С. Редькина // Библиосфера. – 2014. – № 2. – С. 53–58.

6. *Карнауш, А. С.* Перспективы развития информационных технологий в публичных библиотеках / А. С. Карнауш // Библиотека будущего: ежегодный межведомственный сб. науч. тр. – М. : ГПНТБ России, 2014. – С. 42–49.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


***У. К. Зяневіч,***
*прафесар кафедры беларускай народна-песеннай творчасці, дацэнт*


# МОВА І КУЛЬТУРА: З ВОПЫТУ ДЫСКУСІІ ПА МОЎНЫМ ПЫТАННІ 20-Х ГАДОЎ ХХ СТАГОДДЗЯ

Пытанне мовы, якая разам з гістарычнай спадчынай з'яўляецца падмуркам у будаўніцтве беларускай палітычнай нацыі, фактарам умацавання суверэннай беларускай дзяржаўнасці, набывае ў апошнія гады асаблівую вастрыню і актуальнасць. І не толькі ў палітычнай плоскасці, але і ў такой спецыфічнай галіне дзейнасці, як мастацкая творчасць. У перыяды палітычнай нестабільнасці (а менавіта такі перыяд перажывае ў

цяперашні час сусветная глабалізаваная супольнасць) праблема мовы як уласна нацыянальнага кампанента ў сістэме культуры актуалізуецца ў якасці фактара стабільнасці: з’яўляючыся ўласна нацыянальным элементам у сістэме культуры, мова выконвае ахоўную функцыю, спрыяе кансалідацыі нацыі на прынцыпах традыцыйнасці і кансерватызму.

Для асэнсавання сутнасці палемікі, што разгортваецца сёння ў грамадскай думцы, варта звярнуцца да гісторыі пытання, да дыскусій па праблемах мовы і культуры, якія вяліся ў 20-я гады XX ст. у перыяд станаўлення беларускай савецкай дзяржаўнасці. Тады, як і сёння, заваёвы маладой беларускай дзяржавы падвяргаліся націску праціўнікаў беларускай дзяржаўнасці, што знаходзіла адлюстраванне ў абвастрэнні спрэчак па праблемах мовы, фальклору і нацыянальнай мастацкай культуры ўвогуле.

Сутыкненне розных пунктаў погляду на гісторыю, сучасны стан і перспектывы развіцця беларускага мастацтва (рэпертуар, творчы метад, мастацкія плыні і стылі) набывала у 1920-я форму накату вульгарна-сацыялагічнай крытыкі на нацыянальнае мастацтва. Ультралевыя лозунгі новага, «пралетарскага мастацтва» знаходзіліся, па сутнасці, у адной ідэалагічнай плоскасці з непаважлівым і нават абразлівым стаўленнем да беларускага народа і яго духоўнай спадчыны з боку прыхільнікаў «заходнерусізму» – ідэалагічнага кірунку ў дакастрычніцкай грамадска-палітычнай думцы. Паводле тэорыі «заходнерусістаў», Беларусь уяўляецца «геаграфічным рэгіёнам Расіі з некаторымі этнаграфічнымі асаблівасцямі, што ўзніклі не ў выніку развіцця ўнутраных патэнцый народа, а ў выніку шматвяковага гвалтоўнага адарвання «Заходняй Русі» ад дзяржаўных уладанняў адзінага рускага народа. Нацыянальная самастойнасць беларусаў адмаўлялася ва ўсіх аспектах – антрапалагічным, палітычным і культурным» [7]. Пра жывучасць ідэалогіі «заходнерусізму» сведчылі распаўсюджаныя ў 1920-я гады погляды на беларускую культуру – як на нібыта адсталую і неразвітую, не здольную да самаразвіцця. Некаторыя публіцысты ставілі пад сумненне наяўнасць у беларускага народа ўласных гісторыі, мовы, культуры і мастацтва, аж да адмаўлення самога існавання беларускага народа. Яны заклікалі адмовіцца ад нацыянальнага, бачачы ў гэтым адзіную магчымасць развіцця культуры ў Савецкай Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нігілістычныя тэндэнцыі былі рэакцыяй на актывізацыю нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў рэспубліцы. Найбольш ярка яны выявіліся ў другой палове 1920-х гадоў. Паказальныя ў гэтым плане выступленні так званай «полацкай групы» публіцыстаў на чале з А. Р. Пшчолкам. Складзеная імі 16 мая 1926 г. заява ў ЦВК СССР, а пасля і надрукаваны ў віцебскай газеце «Заря Запада» артыкул «Вражда из-за языка» [1] змяшчалі грубыя нападкі на афіцыйную палітыку беларусізацыі, адраджэння беларускай нацыянальнай культуры, што праводзілася ў рэспубліцы з 1923 года. Выступленні прагрэсіўных дзеячаў беларускай культуры на выпады «полацкай групы» паказалі беспадстаўнасць, абсурднасць, надуманасць і псеўданавуковы характар аргументацыі працаўнікаў нацыянальнай культуры беларускага народа. У газеце «Звязда» быў надрукаваны шэраг артыкулаў, у якіх пераканаўча выкрывалася фальсіфікацыя беларускай культуры, што, на думку Пшчолкі, Пігулеўскага, Дзейніса і інш. нібыта не мае «літаральна ніякіх падстаў – ні гістарычных, ні эканамічных, ні навуковых» [3; 4; 5].

Беларуская дэмакратычная крытыка даказвала, што беларуская мова, беларуская культура – гэта не скажоная руская мова, разбаўленая паланізмамі, як пра тое пісалі працаўнікі беларускай культуры, а арыгінальная мова і самабытная культура, якія маюць сваю багатую гісторыю. Удзельнікі дыскусіі нагадвалі, што «ні адзін культурны народ не можа абысціся без запазычанняў чужых слоў, як нельга абсалютна абысціся без увозу чужых тавараў. Гэта агульнае правіла для ўсіх народаў. І калі ў беларускай мове пападаюцца словы польскага паходжання, то гэта тлумачыцца цэлым шэрагам эканамічных і культурна-гістарычных прычын». Сапраўды, працэс моўнага і ў цэлым культурнага ўзаемадзеяння, узаемнага ўзбагачэння праз запазычанне з'яўляецца вынікам гістарычных узаемадачыненняў народаў. Культурныя, у тым ліку і моўныя, запазычанні – непазбежны вынік гістарычных зносін народаў у розных галінах матэрыяльнай і духоўнай дзейнасці. Яны, безумоўна, – з'ява прагрэсіўная, паколькі, з'яўляючыся семантычным выражэннем паняццяў, іх пазначэннем, спрыяюць культурнаму абмену. Кожная мова, у тым ліку і беларуская, на працягу доўгага часу развівалася, узбагачалася праз уключэнне ў свой арсенал іншанацыянальных элементаў, запазычаных са

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знакавых сістэм народаў-суседзяў. Больш за тое, лексічныя запазычанні – гэта толькі адзін з аспектаў этымалогіі мовы, у тым ліку і мовы музычнай. Карціна ўзнікнення культурных феноменаў не будзе зразумелая без уліку не толькі механізма запазычанняў (інавацый і фільтрацый), але і факта генетычнай роднасці. «Кожная славянская мова змяшчае ў сабе пэўную колькасць лексем, каранёў і словаўтваральных фармантаў, якія ўзыходзяць да розных перыядаў моўнага развіцця (індаеўрапейскага, балта-славянскага, праславянскага)». Гэты ж механізм дзейнічае і ў адносінах да культуры ўвогуле. Гарманічна збалансаваныя суадносіны нацыянальнага і агульначалавечага – гэта аснова нармальнага функцыянавання сістэмы нацыянальнай мастацкай культуры. Адсутнасць або недастатковасць канструктыўных іншанацыянальных імпульсаў «звычайна вядзе да застою нацыянальнай культуры, а іх празмернасць разбурае нацыянальную непаўторнасць літаратурна-мастацкай творчасці».

Выступленні нігілістаў, якія адмаўлялі нацыянальныя культурныя традыцыі (у тым ліку музычныя) беларусаў, былі надта далёкія ад сапраўдных інтарэсаў развіцця культуры і мастацтва Беларусі 1920-х гадоў. Гэта былі водгукі шавіністычных ідэй, што абслугоўвалі ў мінулым афіцыйную палітыку царскіх улад у дачыненні да нацыянальных культур народаў Расійскай імперыі. У новых гістарычных умовах нацыянальна-культурнага адраджэння, беларусізацыі прыхільнікі «заходнерусізму» імкнуліся навязаць, укараніць у грамадскую свядомасць думку аб немагчымасці для беларускага народа будаўніцтва ўласнай музычнай культуры, стварэння высокаразвітых нацыянальных формаў прафесійнай музыкі. Заявы пра тое, што «моцная вялікаруская культура павінна скасаваць аслабленыя эканамічна-палітычным укладам жыцця культуры забітых і прыніжаных (инородцев)» [4], да якіх іх аўтары залічалі і беларусаў, падводзілі глебу пад чужыя сапраўднаму інтэрнацыяналізму (якім прыкрываліся іх аўтары) канцэпцыі русіфікацыі нацыянальных культур больш развітай, дынамічнай рускай культурай. Сцвярджалася неабходнасць растварэння гэтых культур у нейкай міфічнай пралетарскай інтэрнацыянальнай (чытай – безнацыянальнай) культуры.

Публіцысты дэмакратычнага кірунку актыўна выкрывалі заявы праціўнікаў беларусізацыі. Д. Жылуновіч у сваім арты-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

куле «Контррэвалюцыя спрабуе мацаць глебу» [4] паказаў, што такія погляды былі, па сутнасці, выказваннем праграмы чарнасоценнага «Беларускага таварыства», створанага ў 1908 г. лідарамі «заходнерусізму» дзеля падрыву беларускага рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху.

Як прапагандысты вульгарна-сацыялагічных ідэй, так і прыхільнікі «заходнерусізму» адлюстроўвалі настроі дэнацыяналізаванай часткі гарадскога насельніцтва рэспублікі. Сацыяльнай базай «заходнерусізму» ў 1920-я гады, паводле слушнай заўвагі У. Ігнатоўскага, часцей за ўсё былі «людзі тутэйшыя, якія выйшлі «ў людзі» з беларускай гушчы» і якія настолькі падпалі пад ассіміляцыйны ўплыў царскай расійскай школы, салдацкай выпраўкі і казармы, мяшчанскага «кваснага» патрыятызму, што прывыклі ўва ўсім нерасейскім бачыць нешта варожае ім, нешта недастойнае іх высокай увагі. У сваім мінулым яны былі лепшымі пастаўшчыкамі «истинно-русского» чыноўніцтва і царскай адміністрацыі. Зараз яны прыспасобіліся да сучаснага становішча, прымазаліся да савецкіх установ нашай Беларусі і ўносяць паўсюду з сабой дух ненавісці і нецярпімасці ў адносінах да ўсяго, што датычыць развітку і выяўлення пралетарска-сялянскай, «чорна-рабочай» культуры» [6]. Выяўляючы сацыяльныя і гістарычныя карані нацыянальнага нігілізму, дэмакратычная крытыка Беларусі звяртала ўвагу на неабходнасць навуковай аргументацыі ў барацьбе са сцвярджэннямі пра тое, што «няма ні беларускага народу, ні беларускай мовы, ні беларускай музыкі». [6] Асабліва важна было абараніць ад іх наскокаў народную творчасць, фальклор. Перад музычна-эстэтычнай думкай 1920-х гадоў стаяла канкрэтная задача – выкрыць як беспадстаўныя вульгарна-сацыялагічныя сцвярджэнні аб тым, што нібыта народныя песня і музыка, фальклор увогуле – гэта рудымент, які не варты ўвагі не толькі з пункту гледжання мастацкай формы, але і з боку ідэйна-эстэтычнага зместу, паказаць ідэйную і мастацкую каштоўнасць музычнага фальклору. Патрабавалі адпору і абывацельскія погляды на народную песню беларусаў як на нешта «простае», «мужыцкае», не вартае ўвагі адукаванага чалавека. Трэба было ўвесці ў грамадскую свядомасць разуменне таго, што фальклор, традыцыйная народная культура і ёсць, уласна кажучы, культура – рэалізаваная народам здольнасць ствараць, адэкватна успрымаць і інтэрпрэтаваць духоўныя каштоўнасці. Адмаўленне ўніверсальнай значнасці народ-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нага мастацтва было адмаўленнем духоўнага патэнцыялу самога народа, стваральніка і носбіта гэтага мастацтва, адмаўленнем нацыянальнай культурнай будучыні.

Працэс пераадолення ў грамадскай свядомасці стэрэатыпаў Беларусі і беларусаў, характэрных для ўяўленняў «заходнерусістаў», усё яшчэ не завершаны, што з'яўляецца тормазам на шляху ўмацавання беларускай дзяржаўнасці. Гэты факт патрабуе ад сучасных філосафаў, культуролагаў, гісторыкаў, палітолагаў комплекснага сістэмнага асэнсавання і навуковага абгрунтавання канцэпцыі беларускай дзяржаўнасці ў працэсе станаўлення беларускай палітычнай нацыі. Як вядома, у аснове фарміравання нацыі – матэрыяльныя і духоўныя сувязі, што аб'ядноўваюць людзей. Нацыя – гэта сукупнасць людзей, якія злучаны пачуццём ідэнтычнасці і агульнай гісторыі, маюць агульную мову, агульную культурную спадчыну, усведамляюць сваё адзінства і асаблівыя нацыянальныя інтарэсы. Паказчыкам прыналежнасці да таго або іншага народа з'яўляецца мова. *Мова – гэта носьбіт культуры* – злучнае звяно паміж мінулым і сучаснасцю, адлюстраванне і ўвасабленне гісторыка-культурнага развіцця народа, яго самабытнасці. У гэтай сувязі ўзрастае роля дзяржавы ў развіцці функцыянальнага патэнцыялу беларускай мовы. Дзейнасць адпаведных устаноў па рэгуляванні моўнай парадыгмы для прывядзення яе ў адпаведнасць з мэтамі і задачамі палітыкі дзяржавы павінна быць накіравана на пошук і выяўленне навуковых заканамернасцяў развіцця або заняпаду мовы ў сучасных умовах і спосабаў эфектыўнага рэгулявання гэтых працэсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ


*1*. Белорусс. Вражда из-за языка. Звезда. 18 мая 1926.

*2. Гурло, Н*. Есть ли белорусский язык «испорченный» русский язык? // Звязда, 1926, 25 мая.

*3. Жылуновіч, З*. Контррэвалюцыя спрабуе мацаць глебу. Звезда, 1926 г. – № 128.

*4. Ігнатоўскі, У*. Беларускае культурна-нацыянальнае пытанне ў БССР. Весьнік Народнага камісарыяту асьветы, 1922. – Вып. 5-6. – С. 1. – Вып. 9-10. – № 6-7.

*5. Лазовский, А*. Про лявониху и цимбалы. // Савецкая Беларусь, 1926, 17 ліпеня.

*6*. Редакционная. Имеет ли белорусский народ свой язык и свою культуру? Распоясавшийся шовинизм. Звезда, 1926, 18 мая.

*7. Цьвікевіч, А*. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А. Цьвікевіч. Менск : Навука і тэхніка, 1993. 352 с.